Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення Віленскай Акругі

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 2
23 верасня 1939 г.
субота

Над краем жабрацтва і гора, уніжэння і слёз узыходзіць лучазарнае сонца свабоды і шчасця

Дружба і брацтва народаў СССР

З вялікай радасцю насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі сустракае доблесныя палкі Чырвонай Арміі. Мільёны людзей, стаміўшыхся ў цяжкай панскай няволі і пад канец кінутых на волю лёсу сваімі жорсткімі і труслівымі правіцелямі, бачаць ў чырвоных спягах сімвал вялікай праўды соцыялізма, вольнага шчастлівага жыцця.

Вялікая Кастрычніцкая Соцыялістычная Рэволюцыя стварыла на месцы быўшай царскай Расіі магутны і вольны саюз адзінапраўных нацый, звязаных узамі непарушнай дружбы і брацкай узаемадапамогі. У рэзультаце пабед соцыялізма „мы маем цяпер упаўне склаўшуюся і вытрымаўшую ўсе выпрабаванні многанацыянальную соцыялістычную дзяржаву, моцнасці якой магла-б пазайздросціць любая нацыянальная дзяржава ў любой часцы света“ (Сталін).

Совецкая многанацыянальная дзяржава моцна, як граніт, і маналітна, як лепшая, высокаякасная сталь. Яна, як неба ад зямлі, адрозніваецца ад многанацыянальных дзяржаў буржуазнага міра.

Гісторыя паказвае, што многанацыянальная дзяржава на буржуазнай аснове раздзіраецца непрымірымымі супярэчнасцямі. Дваццаць год назад ў агні першай сусветнай імперыялістычнай вайны згарэла „ласкутная імперыя“ Аўстра-Венгрыя, уяўляючая сабою спробу стварэння многанацыянальнай дзяржавы ў буржуазнай краіне. На працягу апошніх тыдняў з хуткасцю маланкі рассыпалася, як кэртачны домік, панская Польшча, паўтарыўшая ў сваім развіцці сумны вопыт Аўстра-Венгрыі. Нацыянальнае нераўнапраўе, гнёт і парабашчэнне нямінуча выклікае цэнтрабежныя сілы, абракаючыя дзяржаву на гібель.

Толькі соцыялізм здолеў стварыць сапраўднае брацкае садружаства народаў ў сістэме адзінай нацыянальнай дзяржавы. Соцыялізм знішчыў паразітаў-эксплататараў, — галоўных віноўнікаў і правакатараў нацыянальнай розні і варожасці паміж народамі. На зямлі глыбока ўзрыхленай плугам найвялікшай ў гісторыі рэволюцыі, на зямлі вызваленай ад ланцугоў капіталістычнага рабства, дзіўным цветам расцвіла вялікая дружба народаў СССР.

„...Дружба паміж народамі СССР — вялікая і сур'ёзная заваёва, бо пакуль гэта дружба існуе, народы нашай краіны будуць вольны і непераможны. Ніхто не страшны нам, ні ўнутраныя, ні знешнія ворагі, пакуль гэта дружба жыве і здраўствуе“ (Сталін).

Усё ярчэй расцвітае і мацнее з кожным годам гэта дружба. Совецкі лад з корнем вырваў усе крыніцы нацыянальнага прыгнечання, назаўсёды пакончыў з усімі формамі нацыянальнай няроўнасці, знішчыў да тла ўсе подлыя праявы нацыянальнай варожасці.

Таржаство ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі знайшло сваё законадаўчае афармленне ў Асноўным Законе нашай соцыялістычнай радзімы—Сталінскай Канстытуцыі СССР.

Совецкі лад нятолькі правазгласіў поўнае і нічым не абмежаванае нацыянальнае роўнапраўе, але і стварыў неабходныя матэрыяльныя прадпасылкі для сапраўднага росквіту раней прыгнечаных народаў. Вялікі рускі народ — першы ў сям'і раўных народаў СССР — аказаў магутную падтрымку іншым нацыянальнасцям нашай радзімы і дапамог ім выйсці на шырокую дарогу эканамічнага, палітычнага і культурнага ўздыму. Раней адсталыя нацыянальныя акраіны пакрыліся сеткай прамысловых прадпрыемстваў, іх прасторы прарэзалі новыя чыгуначныя магістралі і водныя артэрыі, на іх нівах пачалі працаваць магутныя атрады стальных коней-трактароў і стэпавых караблеў-камбайнаў.

Аб'ем прамысловай прадукцыі Совецкага Саюза ў 1936 годзе вырас у параўнаніі з 1918 годам у 7,3 разы. За той-жа перыяд прамысловасць беларускай ССР вырасла ў 15,9 раза, Грузінскай ССР у 18,6 раза, Кіргізскай ССР у 95,0 раз. Таджыкскай ССР—у 116,0 раз.

За два дзесяцігоддзя свайго існавання Совецкая Украіна стала краінай магутных гігантаў цяжкай індустрыі, краінай багатых калгасаў. Ужо ў 1936 годзе яе заводы далі ўдвое больш чыгуна, чым выплаўляла ўся царская Расія. У Совецкай Беларусі пабудаваны сотні выдатна абсталяваных прадпрыемстваў, якія забяспечваюць насельніцтва высокаякаснай прадукцыяй.

Гаспадарчы росквіт ідзе ў ногу з гіганцкім ўздымам культуры народаў СССР нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу. Рост гаспадаркі і культуры непарыўна звязаны з стварэннем многалікіх нацыянальных кадраў, з нараджэннем новай, соцыялістычнай, народнай інтэлігенцыі.

У Совецкай Украіне ў 1938—1939 годзе навучалася у пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах 5,5 мільёнаў дзетвары, у тым ліку 2,1 мільёна у 5—10 класах. У вышэйшых навучальных установах Совецкай Украіны ў тым-жа годзе навучалася 124,4 тысячы студэнтаў, у тэхнікумах — 172,4 тысячы навучаючыхся. Ва Украінскай ССР ёсць (па даным 1938 г.) 84 тэатры і тысяча кіноўстановак.

У Совецкай Беларусі ў 1938—1939 годзе навучалася ў пачаткавых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах звыш аднаго мільёна дзетвары, у тым ліку 356 тысяч у 5—10 класах. У вышэйшых навучальных установах Совецкай Беларусі ў тым-жа годзе навучалася 17,1 тысяч студэнтаў, у тэхнікумах 35,9 тысяч навучаючхся. У Беларускай ССР ёсць (па даным 1938 г.) 12 тэатраў і 979 кіноўстановак, у тым ліку 339 гукавых.

Дзесяткі навукова-даследчых інстытутаў забяспечваюць сапраўдны росквіт навуковай творчасці Совецкай Украіны і Совецкай Беларусі, а Акадэміі Навук УССР і БССР з'яўляюцца буйнымі навуковымі цэнтрамі, якім маглі-б пазайздросціць многія буржуазныя краіны.

Совецкі лад адкрыў усім народам СССР невычэрпальную скарбніцу культуры. Культурныя каштоўнасці кожнага з народаў СССР сталі здабыткам усёй брацкай зямлі нашай. Як ніколі б'е нессякаемая крыніца народнай творчасці. Брацкае супрацоўніцтва народоў раскрыла крыніцы невычарпальнай сілы, якая б'е праз край творчай ініцыятывы. Цудоўнай казкай, стаўшай быллю, з'яўляецца Вялікі Ферганскі канал, пабудаваны калгаснікамі сонечнага Узбекістана. Пабудаваная ў баснаслоўна кароткі тэрмін гэта грандыёзная ірыгацыйная пабудова застанецца ў вяках помнікам багатырскай сілы народа, які стаў сапраўдным гаспадаром свайго лёсу.

У гэтыя знамянальныя дні, калі гісторыя перагортвае адну з памятных і яркіх сваіх старонак, мільёны нашых адзінакроўных братоў-украінцаў і братоў-беларусоў вызваляюцца з дапамогай нашай гераічнай Чырвонай Арміі ад ненавіснага і подлага панскага іга. Ажыццяўляецца доўгалетняя мара працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Доўгія гады ўніжэння і смутку засталіся ззаду. Над краем жабрацтва і гора, уніжэння і слёз узыходзіць лучазарнае сонца свабоды і шчасця.

— Мы вас чакалі дваццаць год, — гаварыў адзін старык-селянін у Заходняй Украіне, горача абнімаючы чырвонаармейца. — Ведалі, што Совецкі Саюз вызваліць нас ад гнёта. Я дажыў да таго дня, калі магу ад усёй душы крыкнуць: „Няхай жыве самы вялікі чалавек, любімы, родны Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!“

З іменем Сталіна выконваюць слаўныя палкі Чырванай Арміі сваю вялікую вызваленчую задачу.

(Перадавы артыкул „Праўды“ ад 22 верасня 1939 г.).

Нам дапамагла Чырвоная Армія

Нельга перадаць славамі радасць, якую перажываюць у гэтыя дні сяляне-беларусы. Кожны працоўны беларус удзячны Совецкаму ураду і Чырвонай Арміі, якая вызваліла нас з-пад гнёта памешчыкаў.

Вельмі цяжка жылося працоўным беларусам у панскай Польшчы. Польскія памешчыкі дваццаць год бязлітасна здзекваліся, душылі і мялі беларусоў. Для нас, сялян Заходняй Беларусі, не было ніякіх умоў для існавання. Трэба было жыць упрогаладзь, выносіць непасільны гнёт польскіх паноў.

У селян-беларусаў былі адабраны лепшыя землі і імі карысталіся буйные памешчыкі. А працоўныя сяляне жылі на самых горшых землях і за іх плацілі непасільныя падаткі.

Польскія паны, памешчыкі займаліся адкрытым грабяжом беларускіх вёсак, разаралі гаспадаркі сялян і прымушалі іх ісці ў парабкі за жалкія грашы. Цяжкім ярмом для сялян былі розныя падаткі.

Мы вымушаны былі плаціць за дренную, малаўраджайную зямлю. Зачастую за падаткі забіралі апошнюю карову, авечку. Але падаткам за зямлю не канчаліся паборы польскіх паноў.

За сабаку, які не быў на прывязі, таксама плацілі штраф, за выезд на кані, які не занузданы,— ізноў штраф.

Нечага і казаць, што сяляне-беларусы стагналі і ад падаткаў за выпасы для жывёлы, і за выганы.

Без дазволу нельга было выйсці ў лес за грыбамі, ягадамі, а за дазвол трэба было плаціць падатак памешчыку. За воз хворасту даводзілася таксама плаціць вельмі дорага.

Вось такім праклятым жыццём жылі працоўныя Заходняй Беларусі дваццаць год. Многа давялося ім вынесці на сваіх плячах ад панскага гнёту і парабашчэння.

Селянін-беларус вымушан быў заўсёды залазіць у даўгі. Пазычаў хлеб, шукаў сродкаў для існавання, бо са сваёй гаспадаркі селянін не мог пражыць і палову года. Бывала так, што знімеш ураджай, выплаціш падаткі, уплоціш даўгі з вялікімі процантамі, а потым глядзіш — ледзь толькі на пасеў засталося збожжа. Упрогаладзь жывём зіму, а ў восень зноў прыходзілася тое-ж самае.

Зараз мы вызвалены з пад панскага гнёту Чырвонай Арміяй. Працоўныя беларусы будуць цяпер жыць так, як жывуць нашы адзінакроўныя браты ў Совецкай Беларусі — шчасліва і радасна.

За вызвуленне працоўных беларусоў з-пад гнёту памешчыкаў і капіталістаў мы дзякуем вялікаму таварышу Сталіну, Совецкаму ураду і Чырвонай Арміі. Вялікае дзякуй мы шлём нашым братам-беларусам Совецкай Беларусі, усяму совецкаму народу за тое, што яны нам працягнулі руку брацкай дапамогі і вызвалілі з-пад кабалы і панскага гнёту.

В. О. Лашэвіч
селянін вёскі Войтэшуны
Віленскага ўезда

Будзем жыць поўным шчасцем

Я — селянін. Гаспадарка мая бедняцкая. Свайго хлеба ніколі нехапала на пракармленне сям'і. І я быў вымушан ісці ў горад шукаць работы. Доўга і многа разоў хадзіў па гарадах, а работы так і не знахадзіў.

Тады зноў прыязджаў без грошай да сваёй сям'і і ішоў на міласць, у кабалу к памешчыку. Прасіў міласці даць хлеба ці бульбы на атработкі. Такое жыццё было сялян Заходняй Беларусі, якая стагнала пад ярмом памешчыкаў і капіталістаў.

Часы панавання польскіх паноў назаўсёды застануцца ў маёй памяці і ў памяці маіх дзяцей, як самыя цяжкія часы для працоўных.

Няма слоў, каб выразіць радасць і падзяку ўсяму Совецкаму народу за аказаную брацкую дапамогу пазбавіцца ад ярма памешчыкаў і капіталістаў. Дзякуем таварышу Сталіну за тое, што ён не забыў нас. Дзякуй Рабоча-Селянскай Чырвонай Арміі — нашай вызваліцельніцы.

Рыгор Карсакоў
вёска Разказы, Раканскай воласці.

Надышоў даўно чаканы дзень

Я працую шоферам ужо амаль 30 гад. Добра пазнаў я сутнасць панскага гнёту. Працаваў па 12—14 гадзін у дзень, але нічога не меў, акрамя даўгоў. Мяне паны не лічылі чалавекам, абзывалі дурнем і забаранялі гаварыць на роднай мове, якую яны называлі большэвіцкай.

Але прышла да нас вялікая Чырвоная Армія.

Як радосна забілася сэрца, калі я пачуў родную мову! Гэтага дня я чакаў з нецярпеннем на працягу дваццаці гадоў. Цяпер я вольна магу гаварыць на сваёй роднай мове.

Разам з усімі працоўнымі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны я хачу жыць і працаваць у вялікай і дружнай сям'і народаў СССР.

Ад усяго сэрца дзякуем Совецкаму народу і яго непераможнай Чырвонай Арміі за брацкую дапамогу ў вызваленні ад панскага гнёту.

Шофер **Серкоў Барыс.**

Шчыра ўдзячны таварышу Сталіну

Цяжкім і горкім, як той прыдарожны палын, было жыццё працоўных беларусоў у панскай Польшчы. Сяляне Заходняй Беларусі за 20 год панавання памешчыкаў і капіталістаў вынеслі нямала пакут, даведзеныя да разарэння.

У панскай Польшчы ніхто нелічыў працоўнага беларуса за чалавека. Памешчык, паны і ўсе чыноўнікі польскага ўрада бязлітасна здзекваліся над сялянамі беларусамі, прыгняталі іх.

Вось узяць хоць-бы і нашу вёску Макуцічкі. Памешчык меў у многа разоў больш зямлі, чым усе сяляне вёскі. Прытым, зямля давалася сялянам за непасільныя падаткі і самая горшая.

Многія сяляне нашай вёскі даведзены да жабрацтва і разарэння. Яны вымушаны былі ісці да памешчыка ў парабкі, шукаць заработка на старане. А знайсці работу было не магчыма - трэба было для гэтага мець асобны дазвол урада. Дзе-б ты ні шукаў работы, усёроўна за бясцэнак ішоў на працу да памешчыка.

Польскія паны здзекваліся над беларусамі ўсімі мерамі і сродкамі. Нам не давалі магчымасці навучаць дзяцей на сваёй роднай мове, гвалтоўна прымушалі вучыць дзяцей у польскіх школах. Усе школы зачынілі, заганялі беларускую культуру і мастацтва.

Куды ні прыдзе беларус-селянін — усюды з ім гаварылі толькі на польскай мове. Калі ён не ведае польскай мовы, то яго зусім не слухалі і не жадалі размаўляць. Так было і ў судах і ва ўсіх астатніх установах Польшчы.

Пакутвалі і гібелі працоўныя беларусы пад панскім гнётам. Яшчэ сёння ў многіх сялян-беларусаў не загаіліся раны ад бізуноў польскіх паноў. Білі за ўсё — за неўплату падаткаў, за непавагу да чыноўнікаў. Усякія прычыны знахадзілі польскія паны для таго, каб біць і душыць селяніна.

Працоўныя беларусы рады таму, што Чырвоная Армія вызваліла іх з-пад панскага ярма.

Раз і назаўсёды пакончана з праклятай эксплаатацыяй памешчыкаў і здзекамі панскіх чыноўнікаў.

Мы ў сваіх вёсках са слязамі радасці на вачах сустракалі Чырвоную Армію, — нашу вызваліцельніцу. Як сваіх родных братоў прымалі і частавалі мы байцоў Чырвонай Арміі. Усім, чам былі багаты, сяляне частавалі чырвоных воінаў, якія нясуць для нас радаснае жыццё.

Ніколі цяпер не бываць чорнаму праклятаму часу панавання памешчыкаў і польскіх паноў. Разам са сваімі роднымі братамі з Совецкай Беларусі мы будзем жыць свабодным і радасным жыццём.

Хочацца ад усяго сэрца выказаць падзяку за брацкую дапамогу ўсяму Совецкаму народу, нашым родным братам Совецкай Беларусі, Чырвонай Арміі і вялікаму бацьку ўсіх працоўных таварышу Сталіну.

Іосіф Алексеевіч Чаплаўскі
селянін вёскі Макуцічкі,
Тургельскай воласці.

Аператыўная зводка генеральнага штаба Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі

22 верасня 1939 г.

22 верасня часці Чырвонай Арміі, дзейнічаючыя ў Заходняй Беларусі занялі горад Беласток і крэпасць Брэст-Літоўск і прыступілі да ачысткі аўгустоўскіх лясоў (к паўночна-захаду ад горада Гродна) ад астаткаў польскай арміі.

У Заходняй Украіне часці Чырвонай Арміі вядуць аперацыі па ліквідацыі астаткаў польскай арміі, ачысцілі ад афіцэрскіх груп раён Сарны. Пры ліквідацыі супраціўлення часцей польскай арміі ў раёне горада Львова, часцям Чырвонай Арміі сёння здаліся 6 пяхотных дывізій і 2 асобных стралковых палка, на чале з генералам Лангерам.

Па няпоўным даным за перыяд з 17 па 21 верасня ўзята палонных салдат і афіцэраў польскай арміі 120 тысяч чалавек, захвачана 380 гармат, 1400 кулямётаў.

СССР — краіна рабочых і сялян

У вялікай сям'і адзінаццаці Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, у магутным СССР — першакласнай дзяржаве свету — квітнее і красуецца роўная сярод роўных ордэнаносная Совецкая Беларусь. Яе жыццё, як і жыццё ўсіх совецкіх рэспублік — гэта жыццё многамільённага працоўнага калектыва, для якога праца стала справай чэсці, справай славы, справай доблесці і геройства. Не на паноў эксплаататараў, не на купцоў і фабрыкантаў працуе беларускі народ. Ён працуе на сябе, на сваіх дзяцей, на сваё шчаслівае, радаснае, заможнае жыццё. На заводах і фабрыках, соўгасах і калгасах спорыцца радасная праца чалавека, чуюцца звонкія песні.

Старая, убогая беларуская вёска з карчмой і царквой уступіла месца новай соцыялістычнай вёсцы з клубамі і школамі, яслямі і бальніцамі, трактарамі і камбайнамі.

Радыёвыя дамы, кансультацыі, школы, дамы адпачынку, курорты, кіно, тэатр густой сеткай пакрываюць квітнеючую ордэнаносную Совецкую Беларусь.

Вырасці і змянілі свой выгляд гарады Совецкай Беларусі. На соцыялістычных прадпрыемствах горада Магілева занята звыш 15000 рабочых, сотні інжынераў і тэхнікаў.

За годы Сталінскіх пяцігодак непазнавальна вырас горад Мінск — сталіца ордэнаноснай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. У горадзе дзесяткі буйнейшых і металаапрацоўчых заводаў. Сярод іх такія заводы, як станкабудаўнічы завод імені Варашылава, завод імені Кірава. Гэтыя заводы даюць станкі на важнейшыя ўчасткі соцыялістычнага будаўніцтва і на экспарт. У Мінску гігантам вырасла скурна-абутковая прамысловасць. Завод „Большэвік" з'яўляецца спецыялізаваным заводам па выпрацоўцы хромавых скур.

Мінск — горад культуры. У ім ёсць больш 45 школ з колькасцю вучняў звыш 30 тысяч, а настаўнікаў звыш тысячы чалавек.

У Мінску ёсць Акадэмія Навук, 12 ВНУ, 18 тэхнікумаў, 7 рабфакаў, 12 ФЗУ. Пабудавана рад будынкаў грамадскіх будынкаў. У цэнтры горада пабудован 11-паверховы жалезабетонны будынак, адзеты ў мармуровую кромку — Дом Урада. Насупраць яго — комплекс будынкаў Універсітэцкага гарадка, далей пабудаваны выдатныя дамы, як Дом Чырвонай Арміі, Тэатр оперы і балета, бібліятэка імені Леніна і дзесяткі другіх прыгожых дамоў.

Непазнавальна вырасці таксама гарады Беларускай рэспублікі Віцебск, Гомель, Орша, Барысаў і другія.

За годы Совецкай улады і асабліва за годы сталінскіх пяцігодак Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка ператварылася ў індустрыяльна - калгасную, квітнеючую ордэнаносную рэспубліку.

Удзельная вага прадукцыі прамысловасці ў народнай гаспадарцы Беларусі ўжо ў 1936 годзе дасягнула 72.7 процанта.

Змянілася і сама прамысловасць. Калі яшчэ ў 1925 годзе ў ёй пераважала лёгкая прамысловасць, то ўжо ў 1936 годзе галоўнае месца заняла цяжкая прамысловасць, якая здабывае сыравіну, вырабляе машыны, станкі і іншыя віды абсталявання.

Валавая прадукцыя буйнай прамысловасці Беларусі ўжо ў 1939 годзе дасягнула 1406 мільёнаў рублёў, гэта значыць перавысіла прадукцыю прамысловасці Беларусі 1913 года ў 15,5 раза.

За годы Совецкай улады рэканструявана дрэваапрацоўчая прамысловасць. Пабудаван буйнейшы ў СССР дрэваапрацоўчы Бабруйскі камбінат. Пабудавана Нова-Барысаўская запалкавая фабрыка, узброеная перадавой тэхнікай. Пабудаваны дзесяткі буйных ільназаводаў. Вырасці тэкстыльная, трыкатажная, швейная прамысловасці.

Карэнныя зрухі за годы Совецкай улады адбыліся і ў становішчы рабочага класа. „Пролетарыят СССР ператварыўся ў зусім новы клас, у рабочы клас СССР, які знішчыў капіталістычную сістэму гаспадаркі, які ўцвердзіў соцыялістычную ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці і які накіроўвае совецкае грамадства па шляху камунізма". (Сталін).

Совецкая ўлада зрабіла працоўныя масы гаспадаром усіх багаццяў, якія ёсць у Совецкім Саюзе.

Рабочыя і сяляне атрымалі поўную ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Для працоўных у СССР знікла назаўсёды беспрацоўе, жабрацтва, голад.

Упэўнена і радасна глядзяць кожны рабочы і селянін на сваё будучае.

Грамадзяне СССР маюць права на працу, гэта значыць права на атрыманне гарантыраванай работы з аплатай іх працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і якасцю.

Народы Совецкага Саюза, байцы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота згуртаваны вакол Совецкага ўрада, вакол большэвіцкай партыі, вакол любімага, дарагога Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Наша радзіма цудоўная. Усе народы СССР любяць яе беспрадзельна, і не могуць не любіць яе. СССР — гэта адзіная ў свеце дзяржава, дзе усе працоўныя масы, рабочы клас, сялянства і соцыялістычная інтэлігенцыя з'яўляюцца гаспадарамі свайго шчасця. СССР — гэта адзіная краіна, дзе ва ўладзе стаяць рабочыя і селяне.

І. Матыль.

Прыклад камандзіра Галаўкоўскага

КІЕЎ, 22 верасня. (ТАСС). Наступіла раніца. Адзін з польскіх пастоў, які замаўчаў ноччу, зараз ажыў. Стаў памехай для прасоўвання. Знішчыць пост вінтовачным або кулямётным агнём не было ніякай магчымасці, польскія часавыя заселі ў жалезабетоннай будцы. І як только хто небудзь з нашых байцоў паднімаўся, яны вялі знішчальны агонь.

Адзін з нашых байцоў падпоўз да будкі і громка крыкну: — Здавайцеся, чакаць не будзем. У адказ прагучэў выстрал. Нашы байцы таксама адкрылі агонь, але безрэзультатна. Жалеза - бетон не прабіваецца.

— Таварыш капітан, звярнуўся да камандзіра атрада малодшы лейтэнант Галаўкоўскі, — Дазвольце мне знішчыць пост.

Яшчэ большай нянавісцю напоўнілася сэрца маладога патрыёта, калі на камандны пункт далажылі, што паміж храбрых ад куль ворага пагіб баец Ніжніх.

— Давайце мне гранаты — рашуча сказаў Галаўкоўскі. Ну, жадаю паспеха — адказаў капітан. Усе з затаенай увагай сачылі за смельчаком. Вось ён, прыціскаючыся да зямлі паўзе ўсё бліжэй і бліжэй... Метрах у 15 ад будкі Галаўкоўскі застанавіўся. Секунды пакуль ён рыхтаваўся да браска гранаты здаваліся надзвычайна доўгімі. З нецярпеннем мы чакалі выхода.

Гулкі ўзрыў далёка разнёсся па полю. І як толькі рассеяўся дым ад першай гранаты, Галаўкоўскі кінуў другую. У гэты-ж міг будка была акружана байцамі. Пост ўзят. „Карманная артылерыя" дапамагла. Задача выканана, — далажыў Галаўкоўскі, знімаючы кавалкі гразі з расчарванеўшага твару.

Пісьменнікі і артысты ў Заходняй Украіне

КІЕЎ. УКРАІНА. 22 верасня. (Тасс). Ансамбль Чырвонаармейскай песні і пляскі Кіеўскага дома Чырвонай Арміі з паспехам выступае ў дзейнічаючых часцях фронта. Прыгатаваўшы спэцыяльную праграму з народных песен, ансамбль дае таксама канцэрты ў вёсках і гарадах Заходняй Украіны. Насельніцтва радасна сустракае гэтыя выступленні.

Прыбылі ў Заходнюю Украіну дэпутат Вярхоўнага Совета СССР паэт ордэнаносец — В. І. Лебедеў-Кумач, ордэнаносцы Б. С. Рамашоў і пісьменнік С. І. Башэнаў.

ЗА РУБЯЖОМ

Германа-совецкае комюніке

22 верасня Германскі ўрад і Ўрад СССР устанавілі дэмаркацыйную лінію паміж Германскай і Совецкай арміямі, якая праходзіць па рацэ Нісса да яе ўпадзення ў раку Нарэў, далей па рацэ Нарэў да яе ўпадзення ў раку Буг, далей па рацэ Буг да яе ўпадзення ў раку Вісла, далей па рацэ Вісла да ўпадання ў яе ракі Сан і далей па рацэ Сан да яе вытокаў.

Становішча ў Варшаве

ПАРЫЖ, 21 верасня (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае па радыё наступнае паведамленне: „Польскае радыё перадала ўчора ў 22 гадзіны і 5 мінут з Варшавы, што германскія войскі штурмуюць варшаўскія прадмесці Прагу і Волю. Шум баёў даходзіць да стулы адкуль перадаюцца гэтыя паведамленні.

БЕРЛІН, 21 верасня (ТАСС). Як паведамляюць з Амстэрдама, вялікая частка насельніцтва Варшавы паўстала супроць ваеннага кіраўніцтва. На вуліцах Варшавы паміж асобнымі групамі жыхароў адбываюцца сражэнні пераходзячыя ў сапраўдныя баі. Налічваецца многа забітых і параненых.

У час сражэнняў жыхары Варшавы кідаюць з вакон у змагаючыяся натоўпы каменні, дамашнюю маёмасць, гаращчыя газавыя трапкі і. г. д. У сражэннях прымае ўдзел таксама і паліцыя,

Інтэрніраванне Масціцкага, Бэка і Рыдз-Смігла

НЬЮ-ЁРК 21 верасня (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс, спасылаючыся на аўтарытэтнае паведамленне перадае, што Румынскі ўрад рашыў інтэрніраваць Масціцкага і Бэка.

НЬЮ-ЁРК, 21 верасня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Бухарэста, нягледзячы на англа-французскае пярэчанне, румынскі ўрад аб'явіў аб інтэрніраванні Рыдз-Смігла на час вайны.

Забойства румынскага прэм'ера

Берлін. 21 верасня (ТАСС). Бухарэсцкі карэспандэнт агенцтва „Трансацеан" перадае, што па паведамленню бухарэсцкай радыёстанцыі, сёння забіт румынскі прэмьер Калінэску.

Падрабязнасці забойства яшчэ невядомы. Калі была зроблена спроба перадаць гэта паведамленне па тэлефону праз Будапешт, радыёсувязь была спынена і не ўстаноўлена да 3-х гадзін дня.

Як перадае будапешскі карэспандэнт агенцтва „Трансацеан", паведамленне аб забойстве румынскага прэмьера выклікала вялікую сэнсацыю ў Будапешце. Лічаць, што ў гэту справу замешан Перпетрато Мусці, які з'яўляецца адным з кіраўнікоў распушчанай фашысцкай арганізацыі „Жалезная гвардыя". Калінэску быў міністрам унутраных спраў ва ўрадзе Гога. Ён вядомы, як яры працаўнік „Жалезнай гвардыі". Лічаць, што ён павінен у растрэле кіраўнікоў „Жалезнай Гвардыі" ў лістападзе 1938 г.

Паведамленне румынскага тэлеграфнага агенцтва

Бухарэст 21 верасня (ТАСС). Румынскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што сёння ў 14 гадзін бліз сваёй кватэры быў забіт Старшыня Совета Міністраў Румыніі Калінэску. Забойцы — члены распушчанай арганізацыі „Жалезная гвардыя" — арыштаваны.

Агенцтва дабаўляе да гэтага поведамлення, што новы старшыня Совета Міністраў прыступіць да выканання абавязкаў сёння вечарам, пасля чаго адбудзецца паседжанне ўрада.

Аб'ява

Дырэкцыя гімназіі і вячэрніх курсаў для дарослых „Эдукацыя" даводзіць да ведама студэнтаў, што нармальныя заняткі ў школе пачнуцца з 23 верасня.

Дырэкцыя

Выступленне Чэмберлена ў палаце абшчын

Лондан, 21 верасня, (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр па радыё, выступаючы ўчора ў палаце абшчын Чэмберлен заявіў: за апошні тыдзень адбыліся падзеі такой вялікай важнасці, што покуль яшчэ немагчыма ацаніць іх уплыву на лёс і на пазіцыю іншых краін.

Застанавіўшыся на паражэнні польскай арміі і на пераходзе совецкімі войскамі польскай граніцы, Чэмберлен напомніў аб совецкай ноце перададзенай англійскаму паслу ў Маскве ў якой заяўлялася, што СССР будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў сваіх узаемаадносінах з Англіяй. „У гэтай абстаноўцы, — сказаў Чэмберлен — урад палічыў неабходным апублікаваць 18 верасня заяву, у якой указваў, што неадбылося нічога такога, што магло-б адбіцца на рашымасці англійскага ўрада выканаць свае абавязацельствы". Спыніўшыся на прамове Гітлера, Чэмберлен заявіў: „учарашняя прамова Гітлера ў Данцыгу не змяніла існуючага становішча. Ізлажэнне падзей выкладзеных Гітлерам не можа лічыцца даскана лым".

Характэрызуючы становішча на Заходнім Фронце, Чэмберлен сказаў, што французскія войскі паспяхова працягваюць сваё прасоўванне ўперад. Заняты каштоўныя стратэгічныя аб'екты. Дасягненні ў барацьбе супроць падводных лодак за 2 з невялікім тыдня ваенных дзеянняў праўзашлі поспехі англійскага флота за значна больш працяглыя перыяды ў мінулай вайне. У той час у мінулай вайне ў барацьбе супроць падводных лодак мы займалі абарончую пазіцыю. Зараз мы вядзем наступацельную вайну і рашуча знішчаем падводныя лодкі, як толькі яны абнаружваюць сябе. Я упэўнен, што 6 або 7 германскіх падводных лодак ужо паплаціліся сваім існаваннем за нападзенне на англійскія параходы. Чэмберлен адзначыў, што ў рэзультаце нападзенняў падводных лодак пагіблі 139 англійскіх грамадзян і грамадзян нейтральных краін, не лічачы страт пры затапленні авіяносца „Карыджэс". 44 чалавекі лічацца прапаўшымі без ведама.

Англія, таксама як і Францыя, правяла вялікую падрыхтоўчую работу ў галіне ўмацавання наземных і паветраных сіл, аднак следуе ўспомніць, што ў ва ўсёй падрыхтоўцы да вайны перавага знаходзіцца на баку Германіі. Тым не менш германскія рэсурсы пастаянна і нямінуча зменшаюцца. Мы не павінны праяўляць нецярпенне, калі неадразу адчуваем рэзультаты гэтага.

Спыніўшыся на пытаннях арганізацыі атрадаў грамадзянскай самаабароны і эвакуацыі насельніцтва, Чэмберлен заявіў: той факт, што на працягу першых двух тыдняў вайны Англія яшчэ не падверглася паветранай бамбардыроўцы, не дае падставы для паспяховага і масавага роспуска гэтых атрадаў. Англійскі ўрад і ўрады домініёнаў працягваюць правадзіць падрыхтоўчую работу, якая дала-б магчымасць прымаць самы шырокі ўдзел у прадстаячай барацьбе.

Далей Чэмберлен заявіў, што ён будзе гадаць на даным этапе вайны, калі і дзе будзе сабрана рашаючая сіла або калі наступіць рашучы мамент. Гэта будзе залежыць ад падзей, якія ніхто не можа прадбачыць. Размах нашых прыгатаванняў і той факт, што мы праводзім іх выходзячы з меркавання, што вайна будзе праДаўжацца па крайней меры тры годы, забяспечвае прагрэсіўны рост нашых сіл.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

(Па паведамленнях Тасс з Чунціна)

У цэнтральным Кітаі

У паўночнай часцы правінцыі Цзянсі, японскі атрад у 1000 чалавек пачаў наступленне на кітайскія пазіцыі. Наступленне японцаў сустрэта ўпорным супраціўленнем кітайскай абароны. Баі працягваюцца.

Ва ўсходняй часцы правінцыі Хэнань, у раёне Суйчэноў, кітайскія войскі акружылі атрад салдат марыянетачных улад колькасцю больш 100 чалавек і поўнасцю знішчылі яго; у гэтым-жа раёне кітайскімі войскамі ўзят у палон атрад марыянетачных улад. У сувязі з актывізацыяй партызанскіх атрадаў японскае камандаванне перакідвае ў Кайфын падмацаванні.

У паўночным Кітаі

У паўднёва - ўсходняй часцы правінцыі Шаньсі кітайскія войскі працягваюць наступленне на японскія пазіцыі ў раёнах Чшанязы і Хугуань.

20 верасня японскія самалёты бамбардыравалі рад гарадоў ва ўсходняй часцы правінцыі Фуцзіянь. Забіта і паранена каля 50 мірных жыхароў.

Прамова Чан-Кай-Шы

на зачыненні 4-ай сесіі нацыянальна-палітычнага совета Кітая

Чунцін, 21 верасня. (ТАСС.) Зачыняючы 4 сесію нацыянальна-палітычнага савета, Чан-Кай-Шы заявіў: „Кітай будзе прадаўжаць узброеную барацьбу супроць агрэсіі да таго часу, пакуль не будзе дасягнута канчатковая перамога.

Мэтай вызваленчай вайны з'яўляецца аднаўленне тэрыторыяльнай і адміністрацыйнай недзяльнімасці Кітая.

Чан-Кай-Шы зноў напамінае аб вялікіх цяжкасцях, якія ляжаць на шляху вызваленчай вайны. „Мы верым — працягвае ён, — што ўсе нашы браты выступяць супроць дзеянняў здраднікаў і адкінуць іх салодкія прапановы. Урад выканае прынятыя нацыянальна-палітычным советам прапановы і будзе правадзіць усе мерапрыемствы па ўмацаванню нашых радаў для таго, каб не папасціся на лавушку ворага".

Кранаючыся міжнароднага становішча Кітая, Чан-Кай-Шы сказаў: мы будзем выконваць нашы абавязацельствы разбіваючы планы агрэсараў на Ўсходзе, мы будзем змагацца супроць японскіх планаў заваявання Кітая, а таксама супроць скарыстання агрэсарам міжнароднага становішча і яго планаў даўлення на замежныя краіны.

Кітайскі народ упэўнен, што яго ўзброенае супраціўленне і нацыянальная рэканструкцыя з'яўляецца важнейшым фактарам міра і прагрэса ва ўсім свеце. Кітайская рэспубліка не адступіць ад сваей рашымасці працягваць вайну да перамажнага канца.

ВІЛЬНО

Совецкія кінокарціны

Сёння, 23 верасня, пачынаюць работу ўсе кінотэатры г. Вільно. На экранах кінотэатраў будуць дэманстравацца совецкія кінофільмы.

Насельніцтву горада будуць паказаны лепшыя совецкія кінокарціны — „Ленін у 1918 годзе", „Танкісты", „Александр Неўскі", „Пётр Першы", „Трактарысты" і інш. Усяго на экранах кінотэатраў пойдзе 12 совецкіх кінофільмаў.

Сеансы ў кінотэатрах пачынаюцца з 2 гадзін 30 мінут па мясцоваму часу.

„Сільва" у тэатры „Лютня"

Сёння пачынае сваю работу Віленскі польскі музычны тэатр, які знаходзіцца па вуліцы Міцкевіча № 6. Пойдзе опэрэта „Сільва", музыка Э. Кальмана. Пачатак роўна ў 4 гадзіны 30 мінут па мясцоваму часу.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Адрэс рэдакцыі і друкарні Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.